*УДК 398.332.3*

**Д. І. Дуброўская**
***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***

# ЖАНОЧЫЯ ВОБРАЗЫ ВОСЕНЬСКАЙ АБРАДАВАЙ ПАЭЗІІ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ІЛЬНЯНЫХ ПЕСЕНЬ)

У артыкуле на багатым фактычным матэрыяле восеньскіх ільняных песень выяўлены асноўныя групы жаночых вобразаў (дзяўчына, маладая жанчына, жанчына-ўдава, свякруха, дзяўчына-сірата). Аўтар раскрывае багаты ўнутраны свет лірычных гераінь, высвятляе характар іх узаемаадносін з блізкімі людзьмі.

Восеньскімі песнямі завяршаецца гадавы цыкл земляробчага календара беларусаў. Узнікненне гэтых твораў было абумоўлена заканчэннем гаспадарчых работ і падрыхтоўкай вяскоўцаў да наступлення зімы. «Гэта песні той пары года, калі земляроб збіраў апошні плён сваіх рук і дары прыроды. Яны ў адрозненне ад іншых каляндарных песень не засяроджваюць увагу вакол аднаго якога-небудзь свята, адной падзеі, урачыстасці» [1, с. 5]. Варта адзначыць жыццёвую аснову гэтых песень, у якіх вызначальнымі з’яўляюцца менавіта матывы гаспадарчай працы.

Даследчык А. С. Ліс прапанаваў «пры вызначэнні класіфікацыі абрадавых песень кіравацца крытэрыем працоўнай асновы каляндарнай паэзіі» [1, с. 17]. У фалькларыстыцы вядома наступная класіфікацыя восеньскіх абрадавых песень: падзяляюцца на ярынныя, ільняныя, песні пры зборы ягад і грыбоў, восеньскія лірычныя. Адзначым, што часцей за ўсё названыя жанравыя разнавіднасці восеньскай абрадавай паэзіі былі ўключаны ў песенны рэпертуар дзяўчат і жанчын. Асноўныя матывы гэтых песень надзвычай блізкія да праблематыкі сямейна-бытавой лірыкі, напрыклад, матывы перажыванняў маладой дзяўчыны ў сувязі з замужжам і развітання з бацькамі і домам, а таксама матывы ўзаемаадносін маладой жанчыны з членамі сям’і мужа. Заўважым, што названыя матывы ў першую чаргу звязаны з жаночымі вобразамі. Засяродзім увагу на характарыстыцы ільняных песень, якія выконваліся падчас збірання лёну. Ідэйна-тэматычная адметнасць ільняных песень заключаецца ў тым, што ў гэтай жанравай разнавіднасці восеньскіх песень акцэнтуецца ўвага на праблемах сямейнага жыцця. У тэкстах ільняных песень глыбока раскрываецца шырокі свет чалавечых пачуццяў, у прыватнасці перадаецца глыбіня дзявочых і жаночых перажыванняў. У гэтых песнях сустракаюцца наступныя жаночыя вобразы: маладая дзяўчына, якая збіраецца замуж (*«Калі*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*мяне не выдасце, / я і сама замуж пайду: / што за тын, за вароты, / за суседняга сына»* [2, с. 312]); замужняя маладая жанчына (*«Жаль мне, жаль на матулечку, / што рана мяне замуж аддавала, / не дала мне ў маладых пахадзіць, / дарагіх плаццікаў-шаўкоў панасіць»* [2, с. 311]); жанчына-ўдава (*«Што пад гаем пад зялёным, / там удоўка лянок брала»* [2, с. 319]); дзяўчына-сірата (*«Зямля ж мая сырэнька, / узяла айца, узяла матку, / вазьмі ж мяне, сіротаньку»* [2, с. 316]); свякруха (*«Ажаніла маці сына, ды не па любові»* [2, с. 319]).

Галоўная гераіня ў пераважнай большасці ільняных песень – *«маладая дзевачка»* [2, с. 309], або як яе тут яшчэ называюць: *«маладая»* [2, с. 306], *«дзеўка»* [2, с. 316], *«дзевачка»* [2, с. 315], *«дзяўчоненка»* [2, с. 314], *«дзяўчынанька»* [2, 312], *«маладзіца»* [2, с. 322], якая яшчэ не паспела выйсці замуж. Вобраз маладой дзяўчыны – гэта вобраз прыгожай, вясёлай або сумнай, нявопытнай дзяўчыны: *«Ай, бяда мая, бяда, / што частыя госцейкі, / што часценька прыязджаюць, / Моладу намаўляюць, а матульку спадманываюць. // Не даюць ні вырасці, / Ні касіцы выплесці!»* [2, с. 310]. Перажыванні лірычнай гераіні перадаюцца ў песенных тэкстах праз часавую парадыгму, звычайна гэта разважанні, звязаныя з мінулым жыццём: *«Ой бяда ж мая, бяда, / што сцюдзёная вясна. // Не дала мне вырасці, / майму семю выспеці»* [2, с. 311]; апісанне падзей цяперашняга часу: *«Ай, бяруць мяне, бяруць, / і з карэнькамі ірвуць, / не даюць мне вырасці, / сінім цветам адцвісці»* [2, с. 311]; прадчуванне будучага: *«Як жа мне вясёлаю ў танку стаяці? // Бацюшка, кажа, за князя аддаць, / мамачка, кажа, у чорныя чарнушкі»* [2, с. 310].

У тэкстах ільняных восеньскіх песень іншы раз прычынай няшчаснай долі дзяўчыны з'яўляецца яе знешні выгляд: *«Ой, бяда ж мая, бяда, што я так непрыгожа. // Прыгожыя дзевачкі, яны маюць парачкі, / а я куды ні пайду, сабе пары не знайду»* [2, с. 312]. Дзяўчына вельмі перажывае, што яна такая непрыгожая, і нават размаўляе сама з сабой: *«Бедавала дзевачка, у каморы седзячы, / у каморы седзячы, праз ваконца гледзячы»* [2, с. 312].

Лёс гераіні, як вынікае са зместу песенных тэкстаў, залежыць ад рашэння яе бацькоў. Дзяўчына звяртаецца з просьбай да маці выдаць яе замуж за каханага і называе прычыны свайго няўдалага лёсу, а таксама выказвае рашучае імкненне вырашыць яго самастойна: *«Аддай мяне, матка, за каго я сама хочу! // Не аддала мяне матка, за каго я хацела»* [2, 316]; *«Гаварыла… сваей роднай маці: // – Калі мяне не выдасце, / я і сама замуж пайду»* [2, с. 312].

Вядома, што самае цяжкае ў каханні як для дзяўчыны, так і для хлопца – гэта пара расставання. У шматлікіх песенных варыянтах гучыць матыў прадвызначанасці няшчаснай долі дзяўчыны, што абумоўлена гістарычнай падзеяй – наборам у рэкруты (салдаты):

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*«Чую, чую я нядоленьку сваю, / што не быць яму ў даму, / а быць молайцу у рэкруцкім у наборы, / у салдацкім у прыборы»* [2, с. 318].

Вылучаецца група восеньскіх ільняных песень, у якіх вызначальнымі з'яўляюцца матывы кахання, што і надае гэтым тэкстам аптымістычныя інтанацыі гучання: *«Мілы кажа, мілы кажа: – Я з табою, / з маладою, з маладою. // А мне з мілым лён ірванне, лён ірванне / і гуканне»* [2, с. 306]; *«Мілы кажыць: // – Я з табою, / з маладою. // – Мне з табою, / ай, не рванне – / мілаванне»* [2, с. 307]; *«На пасцельке паляжу, / на мілага пагляджу. // Вось слава, вось і чэсць, / што мілёнак у мяне есць»* [2, с. 320]; *«Татка клічыць – я й не чула. //... Мамка клічыць – я й не чула. //... Мілы клічыць – я пачула, я пачула, / па голасе, па голасе я й пазнала, я й пазнала, / сваім мілым, сваім мілым я й назвала»* [2, с. 322]; *«Клікаў мілы – я й пачула, / па галасочку яго пазнала, / сардэчным дружком яго назвала»* [2, с. 323]. Дзяўчына звязвае свае надзеі на лепшы лёс, як сведчаць асобныя тэкс-ты, з каханым, з якім мае намер быць разам: *«Бог у помач, бог у по-мач, / дзяўчынанька, лянок рваці. //... Ай, паедзем, ай, паедзем, / дзяў-чынанька, з намі, казакамі. //...Пайду ў таткі, пайду ў таткі / запытаю, запытаю»* [2, с. 312].

У некаторых тэкстах восеньскіх песень сустракаецца вобраз замужняй дзяўчыны, перыпетыі лёсу якой цесна звязаны з жыццём у доме мужа: *«Пасцялі пасцеленку / на астатнюю нядзеленку, / на пасцельке паляжу, / на мілага пагляджу. // Вось слава, вось і чэсць, / што мілёнак у мяне есць»* [2, с. 320]. Іншы раз дзяўчына вінаваціць у сваім няшчасці сватоў, якія забралі яе з бацькоўскай хаты, і бацькоў, якія аддалі яе замуж: *«Каб не тыя добрыя людзі, / жыла б я ў мамачкі, / як стала хадзіць, мамачку, прасіць, / мусілі з сабой узяці»* [2, с. 309], *«Жаль мне, жаль на матулечку, / што рана мяне замуж аддавала, / не дала мне ў маладых пахадзіць, / дарагіх плаццікаў-шаўкоў панасіць»* [2, с. 311]. Сустракаюцца песенныя тэксты, калі дзяўчына вініць сябе ў раннім замужжы: *«– Было, дзеўка, замуж не йсці, / да яшчэ лета да й пагуляць. // – Як гуляла, то й гуляла, / мяне маці не спыняла, / а цяпер ты спыніла,/ мая доля нешчаслівая»* [2, с. 322]. Стан унутраных перажыванняў гераіні дасягае кульмінацыйнага мо- манту, калі яна, не вытрымліваючы цяжкасцей сямейнага побыту, вы- рашае пакончыць жыццё самагубствам: *«Аддала мяне мая мамачка / на ўвесь век гараваці. // Гарую гадок, гарую другі, / на трэці аглянуся: / – Не мінаецца мая долечка, / пайду я й утаплюся»* [2, с. 320]. Звычайна дзяўчына, як вынікае са зместу песень, звяртаецца ў асноўным да маці, якая з'яўляецца самым блізкім чалавекам у яе жыцці.

Цэнтральнае месца ў некаторых восеньскіх ільняных песнях адводзіцца вобразу свякрухі, яе ўзаемаадносінам з нявесткай: *«Узяла*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*нявестку, да панятволі, / паслала маць нявестку ў свет лён убраць. // – Не выбераш лёну, не йдзі, шэльма, двору... // Прыказанне злое ад лютай змяі,
/ прыказанне такое, хоць двору не йдзі... // – А дзе, шэльма, гуляла, а дзе, шэльма, была? // – Ці з хлопцамі гуляла, ці белы лён брала?»* [2, с. 319].

Сустракаецца вобраз жанчыны – «удоўкі», якую таксама вельмі не любіць свякроў, лічыць яе чараўніцай, якая і мужа свайго прычара- вала: *«Ой, удоўка – ўсё махлёўка, / яна ўмеець чараваці, / шчаравала свайго мужа»* [2, с. 319].

Асноўную групу восеньскіх ільняных песень складаюць тэксты, у якіх у якасці галоўнага героя выступае дзяўчына-сірата (*«сіротанька»* [2, с. 316], *«сіраціна»* [2, с. 317]). Даведзеная да роспачы, яна жадае, каб яе забрала «зямелька», бо ёй адной вельмі цяжка жыць: *«Зямля ж мая сырэнька, / узяла айца, узяла матку, / вазьмі ж мяне; сіротаньку»* [2, с. 316], *«Ой ты, зямля, ой ты, зямля сырусенька /... узяла маіх, узя- ла маіх айца і матку, / узяла маю ўсю радзіну /... вазьмі мяне, сіраці- ну»* [2, с. 317].

Такім чынам, восеньскія ільняныя песні, аснову кампазіцыйнай структуры якіх складае маналог, адлюстравалі багаты ўнутраны свет жаночай душы, глыбіню думак і пачуццяў галоўных гераінь.

**Спіс літаратуры**

1 Ліс, А. С. Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў: Сістэма жанраў. Эстэтычны аспект / Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т мастацтвазнаў- ства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мн.: Беларуская навука, 1998. – 188 с. – Рэжым доступу: pdf.kamunikat.org/download.php?item= 24665-1.pdf. – Дата доступу: 10.04.2015.

2 Восеньскія і талочныя песні / [Склад. і аўт. уступ. артыкулаў А. С. Ліс; Уклад. і камент. талоч. песень С. Т. Асташэвіч; Муз. частка В. І. Ялатаў; Рэд. А. С. Фядосік].– Мн.: Навука і тэхніка, 1981. – 679 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ